# *Дысертацыю абараняе дырэктар школы*

Ідзе навукова-педагагічная дыскусія. Слова бярэ старшыня спецыялізаванага Савета па абароне дысертацый пры БелНДІ адукацыі доктар педагагічных навук прафесар А. І. Кочатаў: “Мы разам з дырэктарам інстытута У. П. Пархоменкам (у той час намеснікам міністра адукацыі Беларусі) стаялі ля вытокаў эксперымента ў СШ №16 г.Бабруйска. Асабліва пакутавалі і перажывалі, калі вопыт дырэктара Самуіла Залманавіча Рэўзіна “пракацілі” як утопію. З таго часу прайшло чатыры гады, і мы бачым, што эксперымент аказаўся ўдалым. Амерыканскія калегі, якія наведалі сацыяльна-педагагічны комплекс СШ №16, прызналі, што ў Бабруйску створана такая сістэма выхавання, якая аказвае ўплыў на ўсіх, хто знаходзіцца на тэрыторыі СПК (у ЗША такі ўплыў аказваецца выбарачна). Найбольш цікавыя ідэі амерыканскія сацыяльныя педагогі вырашылі апрабаваць у сябе на радзіме... Самуіл Залманавіч Рэўзін — сур’ёзны даследчык, ён выпакутаваў усё тое, што сёння абараняе”.

Сапраўды, вопыт дысертанта надзвычай багаты і разнастайны. Звыш 30 гадоў Самуіл Залманавіч працуе ў школе — спачатку настаўнікам працоўнага навучання, чарчэння, гісторыі, потым арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы, дырэктарам. У рэспубліцы яго ведаюць як актыўнага члена прэзідыума Савета дырэктараў, каардынацыйнага Савета творчых педагогаў, Асацыяцыі педагогаў-даследчыкаў Беларусі. Ён вядзе ў Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі аўтарскія курсы па тэме “Школа з адкрытай выхаваўчай сістэмай”, выступае на міжнародных, усесаюзных, рэспубліканскіх навукова-практычных канферэнцыях і семінарах. Вопытнаму дырэктару прысвоена кваліфікацыя “Сацыяльны інаватар”...

Практычны вопыт — вопытам, але сёння члены Савета бяруць пад перакрыжаваны агонь С. З. Рэўзіна як даследчыка, як будучага вучонага. Вось чаму і пытанні сыплюцца, як проса з снапа: “Як Вы разумееце паняцце “педагагічная рэабілітацыя”?”, “Што такое “выхаванне” і “выхаванасць”?", “Як Вы разумееце метад творчай карэкцыі разумовай дзейнасці вучняў?”, “Як у сацыяльна-педагагічным комплексе вырашаліся пытанні прафесійнай арыентацыі?”, “Сфармулюйце крытэрыі творчай асобы школьніка” і г.д. На абдумванне час не даецца, трэба

адказваць адразу, як вучню на ўроку. І дырэктар, як і яго лепшыя вучні, хутка і ўпэўнена адказаў на ўсе пастаўленыя пытанні.

...Дыскусія працягваецца. Ніхто з членаў Савета не стаіць убаку. "Вопыт СШ №16 г.Бабруйска — гэта той вопыт, які можна выкарыстоўваць у іншых школах, бо ён дэталёва і дакладна апісаны..." (У. Ф. Валадзько, кандыдат педагагічных навук). "Псіхолагі рэспублікі разам з амерыканскімі калегамі і настаўнікамі СШ №16 Бабруйска правялі ў гэтым годзе непасрэдна ў школе навукова-педагагічную дыскусію. Госці з ЗША былі ўражаны высокімі вынікамі работы сацыяльна-педагагічнага комплексу, карыснае з вопыту бабруйчан узялі на ўзбраенне" (Я. Л. Каламінскі, доктар псіхалагічных навук, прафесар). "Падкрэслю навізну даследавання: яна заключаецца ў тым, што СПК сярэдняй школы №16 Бабруйска паклаў пачатак стварэнню ў Беларусі Інстытута сацыяльнай педагогікі і сацыяльных работнікаў" (М. А. Гусакоўскі, кандыдат філасофскіх навук).



С. З. Рэўзін.

Але ў дзвюхгадзіннай дыскусіі вучоныя адзначылі не толькі станоўчае ў даследаванні С. З. Рэўзіна. Былі выказаны таксама і крытычныя заўвагі, недахопы. На іх погляд, патрабуе ўдасканалення і канкрэтызацыі інструментарый укаранення дасягненняў педагагічнай навукі ў практыку; у шэрагу выпадкаў застаецца за кадрам псіхалагічны аспект праблемы; трэба было б правесці параўнальны аналіз СПК з іншымі інстытутамі, сістэмамі адукацыі і выхавання і інш.

Дысертанта, супраць якога прагаласаваў усяго адзін член Савета з 16, наперадзе чакае вялікая і напружаная праца па ўдасканаленні свайго даследавання, напрацоўцы новых методык і палажэнняў, праверцы гіпотэз. Жадаем яму поспехаў у далейшай навукова-педагагічнай дзейнасці і шчыра віншуем!

Чакаем педагогаў-наватараў у Савеце па абароне дысертацый! Хто наступны?..

*В. У. Чэчат,*
*вучоны сакратар спецыялізаванага Савета, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ